Водгук

навуковага кіраўніка на кандыдацкую дысертацыю Калтачэнка Аліны Ігараўны "Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII ст." на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Прадстаўленая да абароны дысертацыя А.І. Калтачэнка выканана ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы па замове Інстытута турызма Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізычнай культуры. За час навучання саіскальніца правяла грунтоўнае даследаванне праблемы, а асноўныя вынікі былі апублікаваны ў двух дзясятках артыкулаў і сталі часткай вучэбнага дапаможніка для профільнай спецыяльнасці галаўнога дыдактычнага цэнтра.

Дысертацыйная работа раскрывае атуальную праблему эвалюцыі адукацыйных падарожжаў і атрыманне функцыянальных ведаў ды навыкаў палітычнымі і маёмаснымі элітамі з Беларусі ва ўніверсітэтах Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII ст. Доўгі час увага айчынных даследчыкаў была закцэнтавана на аналізе трансляцыі еўрапейскіх узораў у адукацыйную прастору беларускіх зямель Вялікага Княства Літоўскага (кальвініцкія гімназіі, езуіцкія калегіумы, піярскія школы), ці працэсу навучання асобных прадстаўнікоў розных сасловій ва ўніверсітэтах Польшчы, Чэхіі, Германіі і інш. Ужо сто год як намаганнямі У.І. Пічэты была падсумавана Скарыніяна – як прыклад адукацыйных і культурных ўзаемаабменаў паміж Беларуссю і асобнымі рэгіёнамі Еўропы. Насёння партрэт Ф. Скарына знаходзіцца ў Залі Сарака Падуанскага ўніверсітэта. Аднак у навуковай і навучальнай літаратуры амаль адсутнічаюць звесткі і аналіз калектыўных працэсаў навучання ў Падуі напрыклад прадстаўнікоў магнацкіх радоў. Так свой след у гэтым адукацыйным цэнтры пакінулі і Сапегі.

У сваёй рабоце саіскальніца Калтачэнка раскрывае феномен адукацыі для прадстаўнікоў магнатэрыі – адукацыйныя падарожжы. Гэта з'ява кардынальна адрознівалася ад атрымання сістэмнай адукацыі прадстаўнікамі шляхецкага ці мяшчанскага саслоўяў, бо не прадугледжавала доўгага знаходжання ў адным універсітэце, горадзе і нават дзяржаве, не абмяжоўвалася толькі універсітэцкімі аўдыторыямі і бурсамі, бо адначасова з'яўлялася стажыроўкай пры каралеўскіх і еўрапейскіх арыстакратычных дварах. За вызначаны перыяд адукацыйныя падарожжы сфарміраваліся ў "пелегрынацыі", а затым эвалюцыянавалі ў "гранд туры". Высновы аўтара абгрунтавана паказваюць функцыянальнасць такой з'явы, магчымасць ёю карыстацца толькі ў прадстаўнікоў магнатэрыі, а таксама вынік такой формы адукацыі на пераатварэнні эканомікі, палітычнай сістэмы, органаў кіравання, на культурныя працэсы ў Вялікім Княстве Літоўскім і асабліва на беларускія землі ў эпоху Барока і Асветніцтва. У якасці прыкладаў грунтоўнага планавання такіх падарожжаў аўтар прыводзіць параўнаўчы аналіз дакументацыі (дзённікі, карэспандэнцыя, рэкамендацыі выкладчыкаў і гувернёраў) прадстаўнікоў двух вядомых беларускіх радоў Радзівілаў і Сапегаў.

Структура дысертацыі дазволіла саіскальніцы выканаць пастаўленыя мэту і задачы ў поўным аб'ёме, зробленыя аўтарам вывады цалкам абгрунтаваныя. Аналіз сабраных крыніц, вылучаныя заканамернасці прыўносяць у айчынную гістарыяграфію новы матэрыял для вывучэння адукацыйных працэсаў ва Усходняй Еўропе і ролю ў іх прадстаўнікоў Беларусі.

Неабходна адзначыць, што моўныя і метадалагічныя кампетэнцыі Аліны Ігараўны цалкам адпавядаюць патрабаванням да спецыялістаў па айчыннай гісторыі XVI–XVIII ст. Саіскальніца свабодна валодае ведамі па сучаснай айчыннай і замежнай гістарыяграфіі гісторыі і адукацыі і функцыянаванню падарожжаў у Еўропе ў ранні Новы час, што безумоўна паўплывала на эфекцыўнасць працы з факталагічным матэрыялам.

Дысертантка і саіскальніца навуковай ступені кандыдата гістарчных навук вельмі сур'ёзна аднеслася да візуалізацыі і сістэматызацыі фактлагічнага матэрыялу, што знайшло сваё ўвасабленне ў дастаткова груваcткім асобным томе Дадаткаў. Што безумоўна варта адзначыць. Дадаткі з'яўляюцца перспектыўнымі матэрыяламі для ўкаранення ў дыдактычнай рабоце і пры стварэнні візуальнага і інш. матэрыялаў вучэбных і метадычных дапаможнікаў, магчыма ўдакладненне адпаведных карт для вучэбных атласаў і падручнікаў.

Такім чынам, дысертацыйная работа з'яўляецца самастойным навуковым даследаваннем выкананым саіскальніцай Алінай Ігараўнай Калтачэнка ў адпаведнасці з патрабаваннямі да навуковых работ падобнага тыпу (пп. 19-26 «Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў» у Рэспубліцы Беларусь), змяшчае новыя навукова-тэарэтычныя высновы па гісторыі і культуры Беларусі XVI–XVIII ст. Безумоўна дысертацыя А.І. Калтачэнка можа быць рэкаментадавана да абароны ў Савеце па абароне дысертацый у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка.

Лічым, што саіскальніцы Калтачэнка Аліне Ігараўне можа быць прызначана навуковая ступень кандыдата гістарычных навук (па спецыяльнасці 07.00.02) за:

– вызначэння стратэгій адукацыйных падарожжаў з тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVIII ст.

– фармуліроўкі прычын і зместу адукацыйных падарожжаў магнатаў з беларускіх зямель Вялікага Княства Літоўскага ў ранні Новы час;

– вызначэнне спецыфічных рыс эвалюцыі выязной адукацыі, якія дазволелі ўдасканаліць сістэму дзяржаўнага кіравання, эканамічнай сістэмы, транслíраваць у наш рэгіён сучасныя дасягненні навукі і матэрыяльнай культуры;

– правядзенне аналізу актавых і наратыўных крыніц, якія выкладаюць сутнасць і матэрыяльны бок з'явы адукацыйных падарожжаў эпохі.

Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі
старажытнага часу і сярэдніх вякоў
гістарычнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.Ул. Любы

БГУ
Исторический факультет
ПОДПИСЬ УДОСТОВЕРЯЮ: